# Камяні - як гістарычныя помнікі Вілейшчыны

**Прырода шчодра адарыла нашу Вілейшчыну сваімі багаццямі - лясамі, палямі, лугамі, рэкамі і азёрамі, якія верна служаць людзям. Але ёсць яшчэ адна рыса гэтых краявідаў - камяні.**

**Раней мы гаварылі аб камянях, як аб непатрэбных для судаходства перашкодах. Цяпер жа мы будзем гаварыць аб камянях, як аб гістарычных каштоўнасцях.**

У звычайных камянях сышліся разам прырода, гісторыя і культура.

Паходжанне валуноў (так называюць навукоўцы камяні памерам звыш 10 см.) у асноўным ледавіковае. Іх апошнія прынеслі ў нашу мясцовасць з поўначы - са Скандынаўскага і Кольскага паўвостраваў. Гэта адбывалася на працягу многіх тысячагоддзяў. Апошняе зледзяненне на тэрыторыі Беларусі адбылося каля 18000 гадоў таму. Пасля растаяння ледавіка з яго вод і утварылася Нарачанска-Вілейская і іншыя нізіны. Акрамя таго, тут засталося шмат разнастайных камянёў.

Асаблівую цікавасць набываюць камяні незвычайнай формы з рознымі знакамі. Адным надавалі звышсілу і пакланяліся як святым, другія лічылі чортавымі або ведзьмінымі і стараліся абмінуць іх.

Так, пры дарозе з Куранца на Савіна ляжыць вялікі валун, часткова ўжо разбураны. Называюць яго і народзе Комсіным камянём. Паводле падання, калісьці тут была хата шаўца Комсіна. На Вялікдзень ён вырашыў пашыць не адну пару ботаў, як у звычайны дзень, а дзве.

Але неўзабаве пачалася навальніца, загрымеў гром, ударыла маланка, забіла шаўца і спаліла хату, на месцы якой і з"явіўся той камень.

Вялікую цікавасць у навукоўцаў (ды і неабыякавых да гісторыі людзей) выклікае "Варацішын хрэст" - звонападобны камень з выбітым крыжам і вышэйуказаным надпісам, датуемым 12 стагоддзем. Яго яшчэ называюць Барысавым каменем. Знаходзіцца ён на беразе ракі Віліі ў Камена. Вёска і абавязана валуну сваёй назвай. На вяршыні каменя толькі цяпер былі выяўлены некалькі ямак - так званыя сляды. Гэта прыводзіць да высновы, што каменю пакланяліся яшчэ пры паганскай культуры, больш тысячы год таму. Гаспадыня агарода, у якім знаходзіцца волат, паказала.яшчэ адзін камень, вяршыня якога ледзь выступае летам сярод бацвіння з зямлі, і расказала паданне. На гэтым месцы вельмі даўно жылі два браты, на гародах якіх па суседству ляжалі два падобныя валуны. Пад імі ораты хавалі, не тоячы адзін ад другога, золата і грошы. Аднойчы ноччу малодшы брат рашыў украсці ў старэйшага яго багацці і пачаў падкопвацца пад братоў камень. Праца была не з лёгкі. Давялося выкапаць вялікую яму, і ў момант апускання ў яе валун абваліўся туды і навякі пахаваў сквапніка да чужога дабра. А той камень і цяпер ляжыць у зямлі, толькі бачны яго верх.

Каля вёскі Крамянец, ляжыць незвычайны камень па назве Дажджбог, якому людзі пакланяліся, калі патрэбна было выклікаць дождж, вылечыцца ад хваробы, выратаваць жывёлу. Сюды абавязкова прыходзілі з пэўнай ахвярай, а ў лункі-сляды каменя жменяй налівалі валу з бочкі без дна, што стала побач, і лічылі святой.

Ёсць яшчэ камяні, якія называюць быкамі ці валамі. Непадалёку ад в.Сцебаракі ў лесе знаходзяцца некалькі такіх валуноў са знакамі, тайну якіх вучоныя не толькі з Беларусі, але і з іншых краін не могуць пакуль што раскрыць.

Некалькі цікавых каменных крыжоў знаходзяцца на старых могілках раёна, аднак большасць з іх ужо даўно знішчана вандаламі і прапалі назаўсёды.

Другія неабходна проста выратаваць.

Каля в.Зачарная, што ў Хаценчыцкім сельсавеце, у лесе знаходзяцца каменныя магілы - месца захавання лудзей дахрысціянскага перыяду. Камяні выкладзены па правільнаму кругу дыяметрам каля 10 м. Ім больш 1000 гадоў, а захаваліся яны амаль у некранутым стане.



Камень •Верацішн хрзп> з вёскі Камена Даўгінаўаага с/с

Сярод значных знаходак - валуны з ямкамі, камяні-следавікі, значэнне якіх у жыцці і быце людзей яшчэ да канца не вызначана. Зразумела толькі, што яны з"яўляліся ао'ектамі пакланення богу. Сярод іх валуны ля вёсак Дварэц, Вуткі, Лыцавічы, Мішуты, Краснаполле. Яны будуць аб"яўлены помнікамі прыроды і ўзяты пад ахову. А раней выяўлены каля в.Бараўцы падобны камень, які валяўся ў меліярацыйнай канаве, устаноўлены ўжо каля Залы выставы краязнаўчага музея Вілейкі.

Як відаць, пры умелым падыходзе і камяні могуць што-небудзь расказачь. А наперадзе новыя пошукі і, магчыма, новыя разгаданыя таямніцы нашай мінуўшчыны.

***Пращ у иапутш ну шары***

***Валеры МікалаевЫ Рогач***
***выкладчык гісторыі ПТВ-48***